было найдено расхождение; если все участники не выявили расхождений при определении лучшего результата, то его поиск можно считать завершённым.

Подводя итоги, можно обобщить, что *Конструктивный Диалог* - это цикличная синхронизация расхождений в описании пониманий действительности, путём определения вопросов (базисов), ответы на которые при помощи научного метода и выявления демагогии будут ранжированы в очереди истинности для определения лучшего результата.

ЛИТЕРАТУРА

1. Маковельский А.О. История логики / А.О. Маковельский; [Рос. акад. естеств. наук и др.]. – Жуковский ; М. : Кучково поле, 2004. – 478 с.
2. Ушаков, Е.В. Философия и методология науки. – М.: Юрайт, 2017. – 392 с.
3. Мартин Голдстейн, Инге Ф. Голдстейн. Как мы познаём. Исследование процесса научного познания / Сокр. пер. с англ. А. Е. Петрова. – М.: Знание, 1984. –256 с.
4. Нестеренко Ю. Л. Демагогия. Классификация демагогических приемов с примерами и советами по противодействию, 2006 [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://fan.lib.ru/n/nesterenko_j_l/text_0610.shtml — Дата доступа: 27.01.2022.

УДК 378.091.313:811.161.3

## САМАСТОЙНАЯ ПРАЦА СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)”

**А. М. Асіпчук**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт» (Рэспубліка Беларусь, 230008, г. Гродна, вул. Церашковай, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Анатацыя. У артыкуле разглядаецца самастойная праца студэнтаў як элемент працэсу навучання і падрыхтоўкі кампетэнтных спецыялістаў.
Ключавыя словы: самастойная праца, навучальны працэс, рэферат-даклад.

## САМОСТОЯТЕЛЬНАЯ РАБОТА СТУДЕНТОВ В ПРОЦЕССЕ ИЗУЧЕНИЯ ДИСЦИПЛИНЫ “БЕЛОРУССКИЙ ЯЗЫК (ПРОФЕССИОНАЛЬНАЯ ЛЕКСИКА)”

**О.Н. Осипчук**
УО «Гродненский государственный аграрный университет» (Республика Беларусь, 230008, г. Гродно, ул. Терешковой, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Аннотация. В статье рассматриваетсясамостоятельная работа студентов как элемент процесса обучения и подготовки компетентных специалистов.
Ключевые слова: самостоятельная работа, учебный процесс, реферат-доклад.

## STUDENTS'INDIVIDUAL WORKIN THE PROCESS OF STUDYING THE DISCIPLINE "THE BELARUSIAN LANGUAGE (PROFESSIONAL VOCABULARY)"

**A.M. Asipchuk**
EI «Grodno State Agrarian University» (Belarus, Grodno, 230008, 28 Tereshkova st.; e-mail: ggau@ggau.by)
Summary. The article deals with the students' individual work as an element of the process of learning and preparing competent specialists.
Key words: individual work, learning process, abstract-report.

Вынікам навучальнага працэсу і прафесійнай падрыхтоўкі ў ВНУ выступае выпускнік з адпаведнымі кампетэнцыямі. Менавіта канкурэнтаздольнасць, кампетэнтнасць, мабільнасць маладога спецыяліста адлюстроўваюць якасць атрыманай ім адукацыі. Засвойванне толькі гатовай, завершанай інфармацыі на лекцыйных і практычных занятках сёння недастатковае. Абавязковай умовай фарміравання пэўных кампетэнцый з'яўляецца самастойная праца студэнтаў, якая характарызуецца пошукавай, творчай дзейнасцю, уменнем вырашаць разнастайныя задачы, выкарыстоўваючы набыты вопыт.

Падчас вывучэння дысцыпліны "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" кіруемая самастойная праца студэнтаў "прадугледжвае падрыхтоўку вусных паведамленняў і пісьмовых рэфератаў па вызначанай тэматыцы, знаёмства з навуковай, навукова-папулярнай літаратурай, рэферыраванне і анатаванне прафесійна арыентаваных тэкстаў" [1, с. 9] і г. д. Трэба адзначыць, што найбольш актуальным у вышэйназваным курсе застаецца менавіта камунікатыўны аспект, паколькі, як слушна заўважае мовазнавец В. А. Ляшчынская, "адукаваны спецыяліст павінен валодаць мовай, ведаць яе законы, правільна і да месца карыстацца яе сродкамі, умець выбраць прыёмы, неабходныя ў пэўнай сітуацыі, для перадачы пэўнага зместу і з пэўнымі мэтамі" [2, с. 3]. Пры арганізацыі кіруемай самастойнай працы выкладчык стараецца ўлічваць базавую (школьную) падрыхтоўку студэнтаў, наяўнасць або адсутнасць матывацыі ў выкарыстанні роднай мовы, праяўляць зацікаўленасць да асобы студэнта,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

заахвочваць нават самыя маленькія дасягненні ў працэсе выканання пастаўленых задач.

Сярод заданняў, якія выносяцца на самастойную працу, найбольш пашыранымі з'яўляюцца рэфераты-даклады, што рыхтуюцца студэнтамі для выступлення на практычных занятках. Тэмы паведамленняў не абмяжоўваюцца толькі прафесійнай накіраванасцю і маюць самыя разнастайныя аспекты: гісторыя, псіхалогія, літаратура, культуралогія, прыродазнаўства, музыка, спорт і інш. Студэнты выбіраюць найбольш цікавыя, на іх думку, тэмы і абавязкова выказваюць сваё меркаванне, часам крытычнае бачанне той ці іншай праблемы. Выступленне можа падмацоўвацца прэзентацыяй. Каштоўнасць вусных паведамленняў падкрэслівае Н. Э. Шандроха наступным чынам: "У вусных паведамленнях адлюстроўваецца светапогляд студэнтаў, узровень іх разумовага і інтэлектуальнага развіцця, памкненні, погляды, грамадзянскія ідэалы, жыццёвы вопыт, стаўленне да свету і людзей" [3, с. 4]. Як правіла, рэферат-даклад пішацца на аснове некалькіх крыніц, таму папярэдне неабходна заканспектаваць іх, прадумаць план выступлення. Пажадана наяўнасць цытат, якімі падмацоўваецца паведамленне. Пры складанні рэфератаў студэнты таксама вучацца афармляць спасылкі ў адпаведнасці з ДАСТам. Рэфераты-даклады як адзін з кампанентаў самастойнай працы студэнтаў садзейнічаюць развіццю навыкаў працы з навуковай літаратурай, уменню якасна перапрацоўваць неабходную інфармацыю, удасканаленню культуры маўлення.

Такім чынам, эфектыўная падрыхтоўка студэнтаў у ВНУ немагчыма без іх мэтанакіраванай самастойнай працы, якая з'яўляецца неад'емнай часткай навучальнага працэсу і служыць для замацавання і паглыблення атрыманых ведаў і навыкаў, пошуку і набыцця новых ведаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская мова (прафесійная лексіка): тыпавая вучэб. праграма для выш. навуч. устаноў / склад.: М.Р. Прыгодзіч, Г.І. Кулеш, Н.П. Лобань; пад рэд. М.Р. Прыгодзіча. – Мінск: РІВШ, 2008. – 28 с.
2. Ляшчынская, В. А. Студэнту аб мове: прафесійная лексіка: вучэб. дапам. / В. А. Ляшчынская. – Мінск: УП «ІВЦ Мінфіна», 2003. – 243 с.
3. Шандроха, Н. Э. Прафесійнае маўленне гісторыка: камунікатыўны аспект : вучэб.-метад. дапам. / Н. Э. Шандроха. – Гродна : ГрДУ, 2007. – 234 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГТУ